# Спэцкурс "Фатаграфія"

**Анатацыя**:

У межах спэцкурсу “Фатаграфія” прапануюцца заняткі, скіраваныя на:

— фармаванне ведаў студэнта ў галіне фотаздымкаў навінаў і дакумэнтальнай фатаграфіі, сучасных тэндэнцыяў і зьменаў;

— выяўленьне новых візуальных моваў, якімі карыстаюцца сучасныя фотажурналісты,

— асэнсаваньне зьнікненьня межаў паміж рэклямай, навінамі, дакументалістыкай;

— засваеньне новых сродкаў выкарыстаньня фатаграфіі-multimedia.

У межах курса ад студэнтаў чакаецца выкананьне фінальнай фотапрацы з элемэнтамі multimedia.

**Выкладчык**:

Андрэй Лянкевіч — фатограф, супрацоўнічае з “European Press Photo Agency” (EPA) і “Anzenberger agency”. Ягоныя працы публікаваліся ў “New York Times”, “Le Figaro”, “Newsweek”, “Die Zeit”, “Spiegel” etc.

**Умовы паступленьня:**

1. Матывацыйны эсэй (разгорнутае тлумачэньне на тэму “Чаму я займаюся фатаграфіяй”. Памер — 1—2 старонкі (1—2,5 тыс. знакаў без прабелаў)
2. Фотаздымкі ўласнага аўтарства (фатаздымкі могуць быць любога жанру; колькасьць — ня больш за 20; памер фота — ня больш за 500 pixels па большым боку).
3. Запоўненая анкета.

Для аплікантаў спэцкурсу “Фатаграфія” сумоўе не прадугледжанае.

**Колькасьць навучэнцаў і працягласьць навучаньня:**

Набор — 10 чалавек па выніках конкурсу матывацыяў і фота.

Заняткі спэцкурса “Фатаграфія” адбываюцца з пэрыядычнасьцю раз месяц.